литической арене станут конкурировать партии, сопоставимые по своему авторитету и влиянию на массы.

УДК 947.6.01 «1917—1918»

Н. М. Якуш, дацэнт

## АФАРМЛЕННЕ ІДЭІ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА САМАВЫЗНАЧЭННЯ Ў ПРАГРАМАХ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921—30-Я ГГ. XX СТ.)

The article analyzes activities of political parties of Western Belarus on development of national movement for self-determination of people.

Паводле Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. да Польшчы была далучана захопленая ёю частка Беларусі плошчай больш як 112 тыс. кв. км з насельніцтвам (1931 г.) — 4,6 млн. чалавек (беларусы — 65 %, палякі — 15 %, яўрэі — 11 %, украінцы — 4 %, літоўцы — 2,5 %, рускія — 2 %). У межах сучасных граніц Беларусі заходнія землі склалі 82 тыс.кв.км, на якіх у 1939 г. пражывала каля 3,5 млн. чалавек.

Палажэнні Рыжскага дагавора, Польскай канстытуцыі 1921 г. і Версальскага трактата дэкларавалі «свабоднае развіццё меншасцей» у складзе Польскай дзяржавы. На практыцы кіруючыя колы Польшчы, якія лічылі беларусаў тэрытарыяльна-дыялектнай групай, імкнуліся да пераўтварэння Заходняй Беларусі ў этнаграфічна польскі рэгіён. Праз асадніцтва, выкарыстоўванне магчымасцей каталіцкага касцёла, няўмольны наступ на беларускую школу, асвету і друк афіцыйная Польшча праводзіла палітыку каланізацыі беларускіх зямель і паланізацыі грамадства. На жаль, шавіністычная палітыка польскіх улад мела падтрымку амаль усіх польскіх партый, якія не жадалі ўлічваць нацыянальныя і сацыяльныя інтарэсы беларускага народа.

Вызваленчую барацьбу большасці насельніцтва Заходняй Беларусі ўзначалілі беларускія палітычныя партыі і арганізацыі, якія дзяліліся на два лагеры: нацыянальна-дэмакратычны і рэвалюцыйна-дэмакратычны. Нацыянальна-дэмакратычныя партыі часта не афармляліся афіцыйна, а існавалі ў выглядзе дробных палітычных і культурных арганізацый і таварыстваў. У Вільні ў 1921—1939 гг. існаваў прадстаўнічы орган беларускіх палітычных партый і грамадскіх арганізацый Заходняй Беларусі — Беларускі нацыянальны камітэт, ці Вільнацбелкам. У яго склад у розныя часы ўваходзілі прадстаўнікі Беларускага пасольскага Клуба, Таварыства беларускай школы (ТБШ), Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД), Камітэта дапамогі ахвярам вайны, Студэнцкага Саюза, Беларускага навуковага і выдавецкага таварыстваў, Бацькоўскага камітэта, рэдакцыі беларускіх газет і іншых партый і арганізацый. Знаходзячыся ў апазіцыі да польскага ўрада, камітэт ставіў сабе за мэту стварэнне Беларуска-Літоўскай дэмакратычнай рэспублікі, напачатку дамогшыся культурна-нацыянальнай аўтаноміі Заходняй Беларусі.

Ідэя нацыянальнага самавызначэння і культурна-асветніцкая справа па захаванню і ўмацаванню нацыянальнай свядомасці беларусаў былі прыярытэтамі ў дзейнасці ўсіх палітычных сіл.

Як тыповая партыя дэмакратыі, БХД (цэнтральны орган — газета «Беларуская крыніца») цалкам арыентавалася на эвалюцыйны шлях развіцця і парламенцкія формы барацьбы грамадства. Праграма партыі фіксавала, што БХД стаіць на прынцыпе сама-

стаўлення народаў, імкнецца да самастойнасці беларускага народа ва ўсіх яго этнаграфічных межах, аб'яднаных у незалежную дзяржаву. Але шляхі да рэалізацыі гэтых ідэй не вызначаліся. З мэтаю пашырэння ўплыву на праваслаўных беларусаў у студзені 1936 г. БХД была перайменавана ў Беларускае нацыянальнае аб'яднанне (БНА).

У 1925 г. пасламі сейма В. Рагуляй і Ф. Ярэмічам у Вільні была створана нацыянальная сялянская партыя — Беларускі сялянскі саюз (БСС), якая выдавала газету «Сялянская ніва» і праіснавала да 1928 г. У нацыянальным пытанні БСС ставіла патрабаванні «самастойнасці беларускага народа на ўсіх яго землях, аб'яднаных у незалежную беларускую рэспубліку» (ЭГБ.— Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1994.— Т. 1.— С. 454).

У чэрвені 1926 г. у Вільні і Варшаве з дапамогай БСС і БХД распачынае працу Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК) — нацыянальна-культурная асветніцкая арганізацыя. Ён стварыў клубы, бібліятэкі, кааператывы па распаўсюджванню асветы і сельскагаспадарчых ведаў. У 1936 г. члены БІГіК супольна з ТБШ выступілі за адкрыццё беларускіх школ.

У Вільні аформілася і нацыянальная група А. Луцкевіча і Р. Астроўскага. У першым нумары яе друкаванага органа «Наперад» падкрэслівалася, што яго рэдакцыя запэўніваецца працаваць у галіне культуры і нацыянальнага адраджэння. У 1930 г. група Луцкевіча—Астроўскага стварае Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый. Цэнтрасаюз выдаваў газету «Беларускі звон», на старонках якой змяшчаліся і артыкулы гістарычнай тэматыкі Беларусі. Сярод лідэраў групы Луцкевіча—Астроўскага не існавала адзінства поглядаў на шляхі вырашэння сацыяльнага і нацыянальнага пытанняў у Заходняй Беларусі. Але яны лічылі магчымым шляхам культурна-нацыянальнага развіцця пошук кампрамісаў з «санацыйным» урадам Ю. Пілсудскага. Пад арганізацыйным кіраўніцтвам групы знаходзіліся таварыства беларускай асветы, Беларускае дабрачыннае таварыства, Беларускае навуковае таварыства і інш.

На чале рэвалюцыйна-дэмакратычнага лагера стаяла Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ ). Яна была створана ў кастрычніку 1923 г. як састаўная частка Камуністычнай партыі Польшчы (КПП), а ў снежні 1923 г. у КПЗБ улілася Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (БРА). Апошняя выдзелілася вясной 1922 г. з левага крыла партыі беларускіх эсэраў у самастойную арганізацыю. Кіраўнікі БРА І. Лагіновіч, А. Канчэўскі, А. Капуцкі былі кааптаваны ў склад ЦК КПЗБ. Партыя стаяла на пазіцыях пралетарскага інтэрнацыяналізму і салідарнасці. Яе праграма змяшчала патрабаванне права самавызначэння Заходняй Беларусі аж да аддзялення ад Польшчы і ўз'яднання з БССР. ЦК КПЗБ выдаваў на беларускай мове газеты «Чырвоны сцяг», «Партработнік», часопіс «Бальшавік» і інш. На польскай мове выходзілі газеты «Куймы бронь», «До волькі», на яўрэйскай — «Ройтэ фон». Пад кіраўніцтвам КПЗБ у студзені 1924 г. быў створаны Камуністычны Саюз Моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ).

У 1922 г. у выніку выбараў ад блока нацыянальных меншасцей, які ўтварылі нацыянальна-дэмакратычныя партыі, у сейм было выбрана 11, а ў сенат 3 дэпутатаў-беларусаў. Яны стварылі ў сейме сваю фракцыю — Беларускі пасольскі (дэпутацкі) клуб, які заняў становішча безадказнай апазіцыі ў польскай дзяржаўнай палітыцы, адстойваў правы беларускага народа, быў салідарны з іншымі нацменшасцямі ў нацыянальных справах.

Група левых дэпутатаў Беларускага пасольскага клуба пад уплывам КПЗБ выйшла з яго і стварыла пасольскі клуб Беларускай Сялянска-рабочай Грамады (БСРГ). У маі—чэрвені 1926 г. БСРГ аформілася як самастойная масавая легальная рэвалюцыйна-дэмакратычная нацыянальна-вызваленчая арганізацыя працоўных. Кіраўнікамі Грама-

ды былі паслы сейма Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла, М. Бурсевіч, П. Валошын. Праграма БСРГ змяшчала асноўныя дэмакратычныя і асобныя сацыялістычныя патрабаванні. У іх ліку і патрабаванні нацыянальнай роўнасці і навучання на роднай мове, самавызначэння Заходняй Беларусі і ўз'яднання з БССР. Грамада выдавала газеты «Жыццё беларуса», « Народная справа», «Наша справа», «Наш голас», «Наша воля», «Народны звон», сатырычны часопіс «Маланка» і інш.

У пачатку 1927 г. Грамада налічвала 120 тыс. членаў, аб'ядноўваючы прадстаўнікоў усіх слаёў працоўных. Акрамя сацыяльнай барацьбы, яна разам з Таварыствам беларускай школы вяла плённую культурна-асветніцкую работу, арганізоўвала збор сродкаў на будаўніцтва беларускіх школ.

У 1928 г. дэпутаты-камуністы польскага сейма стварылі фракцыю — сялянска-рабочы клуб «Змаганне», які імкнуўся прадоўжыць работу Грамады. Ён выдаваў газеты «Світанне», «Голас працы», «На варце» і інш.

Сваю ролю ў фарміраванні нацыянальна-культурнай беларускай ідэі адыграла Таварыства беларускай школы (ТБШ), якое выступіла супраць гвалтоўнай паланізацыі беларусаў. ТБШ было заснавана ў Вільні ў 1921 г. Ля вытокаў гэтай арганізацыі стаяў Б.Тарашкевіч. Асноўнымі напрамкамі дзейнасці ТБШ сталі культурна-асветніцкая работа і рух за школу на роднай мове. Як легальная арганізацыя, Таварыства мела права адкрываць і ўтрымліваць народныя школы, бібліятэкі, арганізоўваць курсы для непісьменных дарослых, настаўніцкія семінары, асветніцкія курсы, выдаваць і распаўсюджваць падручнікі, кнігі і газеты і г. д. Напачатку выдавецтва Таварыства працавала ў Вільні, а кнігарня ў Варшаве. Пасля іх разгрому паліцэйскімі ўладамі Таварыства заснавала выдавецтва «Рунь» у Беластоку.

Дзейнасць Таварыства пашыралася на ўсе заходнебеларускія землі: узніклі акруговыя і павятовыя ўправы, працавалі гурткі, клубы і бібліятэкі-чытальні, арганізоўваліся драматычныя, музычныя секцыі і ладзіліся іх выступленні перад працоўнымі.

Нацыянальны напрамак культурна-асветніцкай работы Таварыства падтрымлівалі партыі і аб'яднанні беларускага руху. Пасля актыўнага супрацоўніцтва з Грамадой Таварыства палітызуецца, што выразна прасочваецца ў яго дзейнасці пачатку 1930-х гадоў. Культурна-асветніцкую дзейнасць ТБШ шырока выкарыстоўвае КПЗБ для правядзення легальнай агітацыі. Ва ўмовах нацыянальнага прыгнечання ТБШ падрыхтавала і выхавала значную колькасць беларускай творчай інтэлігенцыі. Сярод іх — грамадскі дзеяч Браніслаў Тарашкевіч, музыкант і кіраўнік народнага хору Рыгор Шырма, паэты Яўген Скурко (Максім Танк) і Валянцін Таўлай, пісьменнік Піліп Пестрак і інш. Гэта быў самы галоўны набытак у справе абуджэння нацыянальнай свядомасці заходнебеларускага насельніцтва і афармлення ідэі нацыянальна-культурнага адраджэння.

Трэба зазначыць, што на праграмныя палажэнні па нацыянальнаму пытанню накладвалі адбітак і сацыяльныя пазіцыі партый, характар узаемаадносін паміж імі, палітыка польскай дзяржавы ў дачыненні да вызваленчага руху беларусаў. Пры гэтым апошні падвяргаўся пастаяннаму ганенню з боку буржуазных улад. У сакавіку 1927 г. урадам Польшы БСРГ была аб'яўлена па-за законам, а яе дзейнасць — антыдзяржаўнай. Вялікая колькасць членаў партыі былі арыштаваны і ў ходзе судовых працэсаў кінуты за краты. На нелегальным становішчы знаходзілася КПЗБ, прыналежнасць да якой каралася 15-цю гадамі турэмнага зняволення. У 1935 г. забараняецца дзейнасць Беларускага нацыянальнага камітэта.

Такім чынам, можна зазначыць, што:

— ва ўмовах паланізатарскай палітыкі Польшчы на заходнебеларускіх землях нацыянальнае беларускае пытанне афармляецца як палітычны рух за абуджэнне нацыянальнай свядомасці і гістарычнай памяці і як ідэя самавызначэння беларусаў;

— палітычныя аспекты ідэі самавызначэння аформіліся ў трох варыянтах: нацыянальна-культурная аўтаномія Заходняй Беларусі ў складзе дэмакратычнай Польшчы, стварэнне Літоўска-Беларускай дэмакратычнай рэспублікі; уз'яднанне заходне- і ўсходнебеларускіх зямель у рамках буржуазнай або сацыялістычнай Беларускай рэспублікі;

— практычнай рэалізацыяй ідэі самавызначэння падчас знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы сталі культурна-асветніцкая работа ў беларускім грамадстве, рух за захаванне роднай мовы, беларускай школы, навукі, мастацтва.

УДК-327

В. Н. Конобеев, профессор

## ГЛОБАЛИЗАЦИЯ И ГЕОЭКОНОМИКА: НЕКОТОРЫЕ АСПЕКТЫ ОСВОЕНИЯ ГЕОЭКОНОМИЧЕСКОГО ПРОСТРАНСТВА

Многоаспектность глобализации по целям, функциям, субъектам, последствиям ее геоэкономического характера усиленно разрабатывается в последнее время в многочисленных публикациях отечественной (российской) и зарубежной литературы.

В этих публикациях глобализация правомерно рассматривается и как феномен экспансии геоэкономической мощи мировых стран-лидеров в новых исторических условиях, и как объективный процесс, приходящий в противоречие с конкретными интересами различных групп государств, и как попытка достижения мирового господства со стороны небольшой группы наиболее развитых стран мира и установления ею соответствующих «правил игры» в глобальном масштабе.

На Западе вышел ряд трудов, претендующих на солидность исследования феномена глобализации, имеющих в основном цель убедить общественное мнение в объективной неизбежности этого процесса, плодами которого следует разумно воспользоваться и не вызывать глобального уровня противостояния труда и капитала, а также протестно-лудистской реакции общества. При этом просматриваются явные попытки сместить сущностные аспекты этого феномена от глобализации труда и капитала в сторону их подмены противоречием то между «паразитирующими» и «подлинными» глобалистами, то между национальным уровнем современной демократии и наднациональным уровнем производственно-торговой и финансовой глобализации.

Все аспекты глобализации непосредственно связаны с возросшей ролью геоэкономики, геоэкономического пространства, с его возможностями в формировании нового мирового экономического порядка и характера международных отношений в XXI веке.

В силу этого большой практический интерес представляет осмысление феномена глобализации с точки зрения технологии освоения геоэкономического пространства, в котором она разворачивается, в частности институционально-функционального и концептуально-правового аспектов освоения этого пространства как инструментов управления геоэкономическими процессами на глобальном уровне, что и составляет цель